STRENGTHENING
CIVIL SOCIETY
GLOBALLY



# ІНДЭКС УСТОЙЛІВАСЦІ АРГАНІЗАЦЫЙ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ — 2022

## БЕЛАРУСЬ

СНЕЖАНЬ 2023

USAID FROM THE AMERICAN PEOPLE

ICNL INTERNATIONAL CENTER FOR NOT-FOR-PROFIT LAW

fhi360

# ІНДЭКС УСТОЙЛІВАСЦІ АРГАНІЗАЦЫЙ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ

# 2022

## КРАІНЫ ЦЭНТРАЛЬНАЙ І ЎСХОДНЯЙ ЕЎРОПЫ І ЕЎРАЗІІ, БЕЛАРУСЬ


**Тэкст падрыхтавалі:**

Агенцтва Злучаных Штатаў Амерыкі па міжнародным развіцці

Бюро па справах дэмакратыі, канфліктаў і гуманітарнай дапамозе

Цэнтр перадавога досведу ў галіне дэмакратыі, правоў чалавека і кіравання



Гэтае выданне падрыхтаванае дзякуючы падтрымцы Агенцтва Злучаных Штатаў Амерыкі па міжнародным развіцці (USAID) у адпаведнасці з Пагадненнем аб супрацоўніцтве № AID-OAA-LA-17-00003.



**Дысклэймер:**
усе меркаванні, выказаныя ў гэтым дакуменце, з'яўляюцца асабістым пунктам гледжання экспертаў, якія ўдзельнічалі ў ацэнцы Індэкса і падрыхтоўцы справаздачы, і не абавязкова адлюстроўваюць кропку гледжання USAID або FHI 360.

# ЗМЕСТ


Прадмова....3

АГС у краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі ....5

Устойлівасць АГС Беларусі ў 2022 годзе....23

Прававы асяродак ....25

Арганізацыйны патэнцыял....29

Фінансавая ўстойлівасць ....31

Адвакатаванне....34

Аказанне паслугаў ....36

Інфраструктура сектара ....38

Грамадскі імідж....41

# ПРАДМОВА

Агенцтва ЗША па міжнародным развіцці (USAID) прадстаўляе 26-е выданне Індэкса ўстойлівасці арганізацый грамадзянскай супольнасці (АГС) для Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі, якое апісвае падзеі 2022 года ў гэтых краінах. У адрозненне ад папярэдніх гадоў, калі Індэкс ахапліваў усе дваццаць чатыры краіны рэгіёну, сёлета выданне паведамляе пра стан сектараў АГС у дзевяці краінах: Арменіі, Беларусі, Грузіі, Венгрыі, Малдове, Польшчы, Расіі, Сербіі і Украіне.

На працягу чвэрці стагоддзя Індэкс устойлівасці АГС забяспечваў мясцовыя арганізацыі грамадзянскай супольнасці, урады, донараў, навукоўцаў і іншых асоб важнай інфармацыяй аб тэндэнцыях, якія ўплываюць на ўстойлівасць сектараў АГС у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе і Еўразіі. Дакумент паведамляе аб паляпшэнні ці зніжэнні паказчыкаў па сямі ключавых аспектах або «параметрах» устойлівасці сектара грамадзянскай супольнасці: прававое асяроддзе, арганізацыйны патэнцыял, фінансавая ўстойлівасць, адвакатаванне, аказанне паслугаў, інфраструктура сектара і грамадскі імідж.

Метадалогія Індэкса абапіраецца на дадзеныя, якія прадстаўляюцца практыкамі і даследчыкамі АГС, якія ў кожнай краіне ствараюць экспертную групу для ацэнкі сямі параметраў устойлівасці АГС за год. Экспертная група ўзгадняе балы па кожным параметры ад 1 (устойлівасць высокая) да 7 (устойлівасць нізкая). Затым падлічваецца сярэдняя велічыня па ўсіх выстаўленых балах і атрымліваецца агульны бал устойлівасці АГС у кожнай краіне. Рэдакцыйная калегія, якая базуецца ў ЗША і складаецца з тэхнічных і рэгіянальных экспертаў, рэцэнзуе балы кожнай экспертнай групы і адпаведныя апісальныя справаздачы з мэтай захавання аднастайнасці падыходаў і стандартаў для параўнання сітуацыі ў розных краінах.

Больш падрабязна пра метадалогію, якая выкарыстоўваецца для разліку балаў і складання справаздач, можна даведацца ў поўнай версіі Індэкса на англійскай мове на сайце FHI 360.

Індэкс устойлівасці АГС Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі дапаўняе аналагічныя публікацыі па іншых рэгіёнах. За 2022 год таксама даступна рэгіянальнае выданне Індэкса ўстойлівасці АГС, які ацэньвае сектары грамадзянскай супольнасці ў шасці краінах Заходняй Афрыкі.

Такія публікацыі былі б немагчымыя без удзелу шматлікіх прыватных асоб і арганізацый. Мы асабліва ўдзячныя ўдзельнікам і ўдзельніцам экспертных груп. Менавіта на іх ведах, досведзе, ідэях і назіраннях грунтуецца гэты Індэкс.

Хочацца выказаць асаблівую падзяку кіраўніку праекта з FHI 360 Дэвіду Ленетту, рэдактарцы справаздач і супрацоўніцы Міжнароднага цэнтра некамерцыйнага права Джэніфер Сцюарт, а таксама супрацоўніцы USAID Эрын Мак-Карці.

Прыемнага чытання,



Ліза Петэрсан,

Дырэктар Дэпартамента грамадзянскай супольнасці і ўмацавання міру, FHI 360

29 лістапада 2023 г.

# АГЛЯД СІТУАЦЫІ Ў КРАІНАХ ЦЭНТРАЛЬНАЙ І УСХОДНЯЙ ЕЎРОПЫ І ЕЎРАЗІІ Ў 2022 ГОДЗЕ

Гэты выпуск Індэкса ўстойлівасці АГС Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі за 2022 год ахоплівае змены па сямі ключавых вымярэннях, якія ўплываюць на ўстойлівасць сектара АГС у 9 краінах рэгіёну — Арменіі, Беларусі, Грузіі, Венгрыі, Малдове, Польшчы, Расіі, Сербіі і Украіне.

Цягам года грамадзянская супольнасць гэтага рэгіёну вымушаная была дзейнічаць у складаных варунках, выкліканых нападам Расійскай Федэрацыі на Украіну ў лютым 2022 года. У часе гэтага найбуйнейшага ўзброенага канфлікту ў Еўропе з часоў Другой сусветнай вайны тэрыторыя Украіны трапіла пад рэгулярныя абстрэлы, часта скіраваныя на аб'екты грамадзянскай інфраструктуры, у тым ліку школы, медыцынскія ўстановы і энергасеткі. Нягледзячы на першапачатковыя песімістычныя прагнозы, Украіна спыніла наступ Масквы і вярнула большую частку акупаваных тэрыторый. На жаль, напрыканцы 2022 года прыкмет хуткага сканчэння вайны не назіралася.

Супраціў каштаваў Украіне вялізных стратаў. Расія здзяйсняла жудасныя ваенныя злачынствы, у тым ліку адвольныя расстрэлы, масавыя затрыманні, гвалтоўныя выкраданні і напады на грамадзянскае насельніцтва. Ваенны канфлікт прывёў да маштабнай хвалі ўнутранага і знешняга перамяшчэння жыхароў Украіны. Паводле ацэнак Міжнароднай арганізацыі па міграцыі, па стане на снежань 2022 года каля 5,9 млн украінцаў, перадусім жанчын і дзяцей, з'яўляліся ўнутрана перамешчанымі асобамі, а Упраўленне ААН па каардынацыі гуманітарных пытанняў (УКГП) агучвала лічбу 4,9 млн.

## НАСТУПСТВЫ ВАЙНЫ ДЛЯ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ

Беспрэцэдэнтны ваенны канфлікт моцна паўплываў на грамадзянскую супольнасць ва Украіне, Расіі, а таксама ва ўсім рэгіёне.

Украінская грамадзянская супольнасць прадэманстравала жыццяздольнасць і адаптыўнасць, дапамагаючы насельніцтву і арміі забяспечваць матэрыяльныя і іншыя патрэбы, звязаныя з вайной. УКГП высока ацаніла працу АГС і мясцовых добраахвотнікаў па аказанні гуманітарнай дапамогі для амаль 6 млн чалавек. Гэтыя намаганні атрымалі прызнанне і падтрымку грамадскасці, аб чым сведчыць беспрэцэдэнтная плыня дабрачынных ахвяраванняў і валанцёрства. Паводле нацыянальнай справаздачы, гэта паспрыяла павышэнню ўстойлівасці АГС ва Украіне, нягледзячы на жорсткі канфлікт.

Тым часам у Расіі ўрад рэзка абмежаваў грамадзянскія правы і палітычныя свабоды і прымусіў нязгодных змоўкнуць. У сакавіку быў падпісаны Закон аб цэнзуры, які абвясціў злачынствам распаўсюд «фэйкавай» інфармацыі пра ўварванне і фактычна крыміналізаваў выкарыстанне слова «вайна» для апісання канфлікту ва Украіне. Парушэнні закона караліся турэмным зняволеннем на тэрмін да 15 гадоў. Паводле незалежнай праваабарончай і медыя-групы «ОВД-Инфо», на канец 2022 года амаль 21,000 чалавек былі затрыманыя за антываенныя і іншыя палітычныя пратэсты, у тым ліку больш за 5,500 чалавек арыштаваныя за адміністрацыйныя правапарушэнні. Па некаторых ацэнках, каля 900,000 чалавек пакінулі Расію ў 2022 годзе праз наступствы вайны. Расійская грамадзянская супольнасць прадэманстравала сваю трываласць і гнуткасць, але не здолела цалкам пераадолець рэпрэсіўны асяродак, што прывяло да значнага пагаршэння ўстойлівасці расійскіх АГС.

Ваенны канфлікт меў крытычныя наступствы ў іншых краінах рэгіёну. Некалькі краін, ахопленых гэтым выданнем Індэкса, сталі транзітнымі пунктамі ці краінамі пражывання для вялікай колькасці ўцекачоў.

Паводле дадзеных Упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па справах уцекачоў (УВКБ ААН), сярод усіх еўрапейскіх краін у Польшчы была зарэгістраваная найбольшая колькасць уцекачоў – па стане на 20 снежня 2022 года, больш за

1,5 млн чалавек падалі заявы на атрыманне часовай абароны ў Польшчы. Міністэрства ўнутраных справаў Малдовы паведаміла, што да сярэдзіны снежня 2022 года ў Малдову заехалі блізу 650,000 украінцаў, што на душу насельніцтва больш, чым у суседніх дзяржавах або краінах Еўразвязу (ЕЗ). На канец года ў Малдове заставаліся блізу 89,000 уцекачоў. УВКБ ААН паведаміла, што больш за 160,000 украінцаў прыехалі ў Грузію ў перыяд з лютага па лістапад 2022 года.

Арганізацыі грамадзянскай супольнасці ў Польшчы, Малдове і Грузіі кампетэнтна рэагавалі на патрэбы уцекачоў. У Польшчы АГС узялі на сябе вядучую ролю ў каардынацыі дапамогі ўцекачам пры падтрымцы мясцовага бізнесу і ўлады. АГС Малдовы былі аднымі з першых, хто адгукнуліся і падтрымалі ўцекачоў. Паводле справаздачы Альянса актыўных НДА ў галіне сацыяльнай абароны дзяцей і сям'і, 100 апытаных АГС Малдовы падтрымалі прыкладна 240,000 уцекачоў на агульную суму каля $6,5 млн у перыяд з сакавіка па травень 2022 года. У Грузіі ўцекачы мелі такія паслугі ад АГС, як псіхасацыяльная, грашовая і гуманітарная дапамога, медыцынскія паслугі і доступ да адукацыі.

Дзеянні АГС па змякчэнні наступстваў крызісу былі ўхвальна ўспрынятыя грамадскасцю ва ўсіх трох краінах. Мясцовыя супольнасці аказвалі значную фінансавую падтрымку для Украіны. Напрыклад, у Грузіі стварылі старонку Ukraina.ge для збору данатаў для Украіны і сувязі ахвярадаўцаў і валанцёраў з тымі, хто мелі патрэбу ў дапамозе. Цягам першага года сайт сабраў грашовыя і матэрыяльныя ахвяраванні на суму 1,181,400 лары (каля $454,000).

З палітычнага пункту гледжання, расійскае ўварванне стала штуршком да інтэнсіфікацыі інтэграцыі краін рэгіёну ў ЕЗ. У чэрвені 2022 года, менш чым праз чатыры месяцы пасля падачы заявы, Малдова і Украіна атрымалі афіцыйны статус кандыдатаў на ўступленне ў ЕЗ. Умовамі атрымання статусу сябра ЕЗ былі названыя правядзенне рэформ у такіх сферах, як судовая сістэма, барацьба з карупцыяй, дзяржаўнае кіраванне і правы чалавека. Грузія таксама падала заяўку на атрыманне статусу кандыдата ў ЕЗ у сакавіку 2022 года. У адрозненне ад вышэйзгаданых краін, Грузіі была прадастаўлена «перспектыва сяброўства», залежная ад выканання 12 умоваў – ад ліквідацыі палітычнай палярызацыі ў

краіне да забеспячэння ўдзелу грамадзянскай супольнасці ў працэсах прыняцця рашэнняў на ўсіх узроўнях.

АГС Украіны, Малдовы і Грузіі актыўна ўдзельнічалі ў прасоўванні рэформ, зацверджаных ЕЗ у 2022 годзе. Ва Украіне АГС засяродзіліся на судовай рэформе і барацьбе з карупцыяй, а таксама спрыялі развіццю дэмакратычных механізмаў, інструментаў шырокага ўдзелу ў палітыцы, празрыстасці і падсправаздачнасці ўрада. У Малдове АГС удзельнічалі ў працы кіруючых камітэтаў, выступалі і кантралявалі працэс правядзення рэформ, вызначаных Еўразвязам, а таксама дапамагалі фармуляваць адказы на апытальнік Еўрапейскай камісіі, прызначаны для ацэнкі заяўкі Малдовы на ўступленне ў ЕЗ. У Грузіі 23 мясцовыя і міжнародныя арганізацыі сумесна распрацавалі план, у якім выкладаецца адзінае бачанне крокаў, неабходных для выканання 12 умоваў ЕЗ. Урад, аднак, праігнараваў гэты план і працягваў абмяжоўваць удзел грамадскіх арганізацый у прыняцці рашэнняў.

Вайна паўплывала на фінансавую ўстойлівасць АГС у некалькіх краінах. Паводле апытання «Пульс НДА», 40% АГС Расіі паведамілі пра скарачэнне агульнага аб’ёму фінансавання ў 2022 годзе. Галоўным чынам, гэта было выклікана ўвядзеннем санкцый Захаду ў адказ на вайну, у выніку чаго многія незалежныя і сацыяльна-арыентаваныя АГС страцілі падтрымку замежных донараў і міжнароднага бізнесу, які сышоў з Расіі. Адмова міжнародных плацёжных сервісаў, у тым ліку Visa, MasterCard і Apple Pay, абслугоўваць расійскіх кліентаў, адключэнне расійскіх банкаў ад глабальнай фінансавай тэлекамунікацыйнай сістэмы SWIFT прывялі да далейшага скарачэння фінансавання. У сувязі з зыходам шматлікіх міжнародных кампаній з Расіі многія буйныя АГС у 2022 годзе сутыкнуліся з істотным скарачэннем карпаратыўных ахвяраванняў. У справаздачы па Грузіі таксама адзначаецца, што ўзровень замежнага фінансавання скараціўся ў 2022 годзе галоўным чынам праз тое, што донары накіроўвалі падтрымку перадусім ва Украіну.

Адначасова вайна прывяла да ўзмацнення фінансавай устойлівасці Украіны і Малдовы, паколькі замежныя і мясцовыя донары павялічылі сваю падтрымку для АГС, якія працавалі з наступствамі вайны. У 2022 годзе фінансаванне Украіны з боку замежных донараў было вельмі значным. Паводле

ForeignAssistance.gov, у 2022 годзе ЗША перадалі Украіне рэкордныя $8,6 млрд на развіццё ўрада і грамадзянскай супольнасці ў параўнанні з $93 млн ў 2021 годзе. З гэтай сумы АГС, зарэгістраваныя па-за межамі ЗША, атрымалі $86,37 млн у параўнанні з $16,45 млн ў 2021 годзе.

Ахвяраванні ад прыватных асоб і прадпрыемстваў таксама былі важнай крыніцай для ўкраінскіх дабрачынных фондаў. Напрыклад, памер ахвяраванняў у фонд «Повернись живим» склаў 5,7 млрд грыўняў (каля $196 млн), а Дабрачынны фонд Сяргея Прытулы атрымаў 4,2 млрд грыўняў (каля $145 млн) цягам першага года вайны, што дазволіла пакрыць выдаткі на абсталяванне, навучанне і матэрыялы для тактычнай медычнай падрыхтоўкі і нават на зброю для вайскоўцаў. Што тычыцца малдоўскіх АГС, звесткі аб агульных сумах адсутнічаюць, але вядома, што для падтрымкі плыні ўцекачоў было атрымана значнае замежнае фінансаванне, што паспрыяла павышэнню фінансавай устойлівасці сектара.

## ПАГАРШЭННЕ ПРАВАВОГА АСЯРОДДЗЯ

Ахоп меншай колькасці краін у Індэксе за 2022 год не дае магчымасці для паўнавартасных абагульненняў. Тым не менш, у нацыянальных справаздачах назіраюцца такія тэндэнцыі, як далейшае пагаршэнне прававога асяроддзя для працы АГС і іх фінансавай устойлівасці.

Прававое асяроддзе, якое рэгулюе дзейнасць АГС, пагоршылася ў шасці з дзевяці краін, ахопленых Індэксам за 2022 год, а астатнія тры краіны (Арменія, Малдова і Украіна) адзначылі адсутнасць зменаў у прававым асяроддзі. Найбольш рэзкае пагаршэнне сітуацыі адбылося ў Расіі, дзе ўрад увёў мноства рэпрэсіўных законаў, відавочна скіраваных на незалежныя і праваабарончыя АГС, а таксама рабіў іншыя захады для абмежавання грамадзянскіх правоў і палітычных свабод. У выніку ацэнка прававога асяроддзя для АГС у Расіі рэзка ўпала да 6.8, што стала адным з самых нізкіх паказчыкаў сярод усіх краін, ахопленых Індэксам за апошнюю чвэрць стагоддзя.

Адзінай краінай у Еўропе і Еўразіі з яшчэ больш рэпрэсіўным прававым асяроддзем для АГС застаецца Беларусь. Яшчэ ў 2021 годзе прававое асяроддзе

Беларусі ацэньвалася на ўзроўні 7.0 – гэта самы нізкі бал, магчымы па шкале ацэнкі Індэкса. Лічба не здолела адлюстраваць далейшае пагаршэнне, але ў 2022 годзе прававое асяроддзе стала яшчэ больш жорсткім праз узмацненне маштабных рэпрэсій супраць АГС. Гэты ціск прымаў розныя формы, у тым ліку праверкі, пісьмовыя папярэджанні, прыпыненне дзейнасці, адміністрацыйныя і крымінальныя абвінавачванні супраць кіраўнікоў, супрацоўнікаў і валанцёраў АГС, ціск на сваякоў і блізкіх супрацоўнікаў і актывістаў АГС,ператрусы ў офісах АГС і па месцы жыхарства супрацоўнікаў, прымусовая ліквідацыя і самаліквідацыя АГС, блакаванне доступу да вэб-сайтаў, прызнанне экстрэмісцкімі інфармацыйных матэрыялаў і арганізацый, якія іх выпрацоўваюць, дыфамацыя ў сродках масавай інфармацыі. Рэпрэсіўная практыка, скіраваная супраць грамадзянскай актыўнасці, была замацаваная ў заканадаўстве. Напрыклад, былі прынятыя пастановы аб «адмысловай судовай вытворчасці», якія дазваляюць праводзіць завочныя судовыя працэсы над актывістамі, якія з’ехалі з краіны. У выніку пагаршэння сітуацыі ў Расіі і Беларусі многія АГС і актывісты рэлакаваліся за мяжу.

У іншых краінах, уключаных у Індэкс ў 2022 годзе, прававое асяроддзе больш спрыяльнае; усе ацэнкі трапляюць у сярэднюю катэгорыю «Нестабільная ўстойлівасць» з паказчыкамі ад 3.1 да 5.0. Пры гэтым, у прыватнасці, у Венгрыі, Польшчы і Сербіі, адзначаюцца доўгатэрміновыя адмоўныя тэндэнцыі.

У 2022 годзе паказчыкі прававога асяроддзя ў Венгрыі, Польшчы і Сербіі знізіліся нязначна (на 0.1), але за апошняе дзесяцігоддзе яны моцна пагоршыліся. Так, напрыклад, Венгрыя прайшла шлях ад краіны з самым высокім паказчыкам прававога асяроддзя ў Еўропе і Еўразіі з 1998 па 2008 гады (за гэты час ацэнкі ваганіся ад 1.0 да 1.5) да 4.1 бала ў 2022 годзе. Гэты рэзкі спад стаўся вынікам мэтанакіраванай палітыкі кіруючай правай партыі «Фідэс» па абмежаванні грамадзянскай прасторы.

Падобным чынам ацэнка прававога асяроддзя Польшчы ўпала з зайздросных 2.1 бала (што адпавядае катэгорыі «Павышаная ўстойлівасць») у 2016 годзе да 3.4 балы ў 2022 годзе. Спад быў выкліканы палітыкай польскага папулісцкага ўрада.

Прававое асяроддзе Сербіі ніколі не было такім спрыяльным, як у Венгрыі ці Польшчы; ва ўмовах сталага ціску на АГС з боку дзяржавы гэты паказчык знізіўся з 3.9 балаў у 2014 годзе да 4.9 балаў (катэгорыя «Стрыманае развіццё ўстойлівасці») у 2022 годзе.

Ва ўсіх трох краінах пераслед незалежных арганізацый з боку ўрада стаў галоўнай прычынай зніжэння паказчыкаў прававога асяроддзя ў 2022 годзе. У Венгрыі ўлады аштрафавалі 16 АГС, якія арганізавалі кампанію па прызнанні несапраўдным рэферэндуму, арганізаваным урадам, супраць ЛГБТ-супольнасці. У Польшчы праваабарончыя АГС сутыкнуліся з працэсуальным пераследам: АГС і незалежныя групы, якія дапамагалі мігрантам на польска-беларускай мяжы ў 2021 годзе, траплялі пад судовы пераслед цягам усяго 2022 года, а актывісткі, якія дапамагалі атрымаць доступ да бяспечных абортаў, былі прыцягнутыя да крымінальнай адказнасці. У Сербіі паліцыя перашкаджала грамадзянам далучацца да пратэстаў, пагражала пратэстоўцам і ўжывала да іх празмерную сілу. СМІ і актывісты сталі аб'ектамі шматлікіх судовых працэсаў супраць грамадскага ўдзелу (SLAPP), у выніку чаго еўрапейская Анты-SLAPP Кааліцыя намінавала Сербію на званне «Краіна года па колькасці SLAPP».

Грузія захоўвае адзін з самых высокіх паказчыкаў устойлівасці прававога асяроддзя для АГС у Еўразіі, аднак у 2022 годзе, другі год запар, таксама паведамляецца пра пагаршэнне сітуацыі. Нядаўнія змены ў Законе аб прадпрымальніцтве патрабуюць перарэгістрацыю АГС, што накладае на іх дадатковы фінансавы і адміністрацыйны цяжар. Акрамя таго, напрыканцы 2022 года сябры кіруючай партыі абвясцілі, што працуюць над Законам аб «замежных агентах», які ўяўляе сабой копію рэпрэсіўнага расійскага закона і з'яўляецца адкрытай атакай на грамадзянскую супольнасць і свабоду выказвання меркаванняў у Грузіі. У сакавіку 2023 года закон быў адкліканы, але сама сітуацыя стала сведчаннем нізкага ўзроўню развіцця дэмакратыі і грамадзянскай прасторы ў Грузіі і падрыхтавала глебу для далейшага пагаршэння прававога асяроддзя для грамадзянскай супольнасці.

## ПАГАРШЭННЕ ФІНАНСАВАЙ УСТОЙЛІВАСЦІ

Фінансавая ўстойлівасць ужо доўгі час з’яўляецца самым слабым вымярэннем устойлівасці АГС Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі. Падзеі 2022 года надалей пагоршылі фінансавыя перспектывы АГС: пяць з дзевяці краін – Венгрыя, Сербія, Беларусь, Грузія і Расія – паведамілі аб зніжэнні фінансавай устойлівасці цягам года. Самы вялікі спад назіраўся ў Расіі, дзе ўвядзенне заходніх санкцый у адказ на вайну рэзка паўплывала на доступ АГС да фінансавання. У той жа час замежныя і ўнутраныя ахвяраванні, накіраваныя на дапамогу АГС у працы з уцекачамі і іншымі пацярпелымі ад вайны, павялічылі фінансавую ўстойлівасць Малдовы і Украіны.

Нестабільныя эканамічныя варункі па ўсім свеце, у тым ліку імклівы рост інфляцыі, сталіся вынікам фінансавых праблем АГС у Венгрыі, Сербіі і Грузіі. У Венгрыі інфляцыя на канец года дасягнула нечаканых 25%. Гэта стала вынікам таго, што колькасць ахвярадаўцаў, якія пералічылі 1% сваіх падаткаў на АГС у 2022 годзе, знізілася на 13% у параўнанні з папярэднім годам.

АГС Венгрыі маюць занепакой, што інфляцыйны крызіс будзе мець негатыўны ўплыў на поспех будучых намаганняў па прыцягненні сродкаў. У Сербіі, дзе інфляцыя дасягнула 15%, АГС з цяжкасцю пакрывалі свае выдаткі.

Праблема ўзмацнялася тым, што большая частка фінансавання для сектара паступала ад замежных донараў і не брала да ўліку рост інфляцыі. Акрамя таго, праз эканамічны крызіс карпаратыўныя ахвяраванні для АГС скараціліся з 5,3 млн еўра ў 2021 годзе да 3,4 млн еўра ў 2022 годзе. Агулам фінансавая ўстойлівасць у АГС Польшчы засталася нязменнай, але арганізацыі былі занепакоеныя тым, што эканамічны крызіс можа зменшыць бюджэты мясцовых органаў улады і яшчэ больш абмежаваць аб’ём індывідуальных і карпаратыўных ахвяраванняў, што паўплывае на ўстойлівасць у будучыні. Высокія тэмпы інфляцыі ў Венгрыі, Польшчы і Сербіі таксама заміналі АГС прыцягваць і ўтрымліваць кваліфікаваныя кадры.

Дзяржаўнае фінансаванне па-ранейшаму заставалася важнай крыніцай падтрымкі АГС па ўсёй Еўропе і Еўразіі. Пры гэтым дзяржаўныя сродкі часта

размяркоўваліся прадузята, што спрыяла зніжэнню фінансавай устойлівасці АГС у шэрагу краін у 2022 годзе.

У Расіі дзяржаўныя гранты заставаліся найважнейшай крыніцай фінансавання АГС сектара. Аднак дзяржаўным фінансаваннем карысталіся праўладныя НДА (GONGO) і іншыя квазі-дзяржаўныя структуры, якія не падпадаюць пад вызначэнне АГС у дадзенай справаздачы, а незалежныя і праваабарончыя АГС мелі абмежаваны доступ да гэтай крыніцы фінансавання. Гэтаксама каля 44% фінансавай дапамогі для АГС Венгрыі прыпадае на дзяржаўную падтрымку, але працэс прыняцця рашэнняў з’яўляецца палітычна прадузятым на карысць арганізацый, якія непасрэдна кантралююцца мясцовымі сябрамі партыі «Фідэс» або іх саюзнікамі. У выніку незалежныя арганізацыі, хаця фармальна і не пазбаўленыя права падаваць заяўкі на дзяржаўнае фінансаванне, рэдка атрымліваюць гранты. У Грузіі верагоднасць прыняцця Закона аб «замежных агентах» паглыбіла недавер паміж АГС і дзяржавай і знізіла перспектыву звароту АГС па дзяржаўнае фінансаванне.

Фінансавая ўстойлівасць АГС Арменіі і Польшчы ў 2022 годзе не змянілася, але ў абедзвюх справаздачах адзначаюцца праблемы, звязаныя з няроўным размеркаваннем дзяржаўнага фінансавання. Так, у Арменіі некалькі міністэрстваў вылучаюць фінансаванне АГС, але больш прыхільна ставяцца да арганізацый, якія прапаноўваюць паслугі, чым да праваабарончых, маніторынгавых або экалагічных ініцыятыў. Антыліберальныя, нацыяналістычныя і радыкальныя правыя арганізацыі працягвалі атрымліваць значную фінансавую падтрымку ад польскага ўрада. Палітычная прадузятасць з’яўляецца сур’ёзным фактарам у Польшчы, дзе ўсё большая доля дзяржаўных сродкаў накіроўваецца АГС, звязаным асабіста ці ідэалагічна з дзейным урадам, а таксама каталіцкай царквой. Ілюстратыўным кейсам такога стаўлення ў 2022 годзе з’яўляецца справа «Віла Плюс», калі міністр адукацыі вылучыў сродкі на набыццё і рэканструкцыю дарагой нерухомасці АГС, блізкім да кіруючай партыі.

Замежнае фінансаванне застаецца важнай крыніцай фінансавання ў сектары, хаця ў справаздачах па Арменіі, Грузіі, Венгрыі, Польшчы і Сербіі адзначаецца, што гэтымі сродкамі часта карыстаецца невялікая група АГС, якія валодаюць ведамі, чалавечымі рэсурсамі і сістэмамі забеспячэння адпаведнасці

патрабаванняў замежных донараў. Мясцовыя АГС звычайна атрымліваюць замежнае фінансаванне праз невялікія субгранты, якія размяркоўваюцца вышэйзгаданымі арганізацыямі. Гэтая падтрымка застаецца важнай крыніцай фінансавання, але ўсё часцей мясцовыя АГС крытычна адзначаюць, што такі падыход абмяжоўвае ахоп дзейнасці і магчымасці для доўгатэрміновага арганізацыйнага развіцця. У 2022 годзе АГС у Сербіі пачалі стварэнне нефармальнай сеткі для вырашэння гэтай праблемы.

АГС у Беларусі адзначылі самую слабую фінансавую ўстойлівасць як у Еўразіі, так і сярод усіх краін, ахопленых Індэксам за апошнія гады. У 2022 годзе гэты паказчык зноў знізіўся, паколькі аўтарытарны ўрад краіны прымаў і ажыццяўляў абмежавальныя палітычныя захады, якія ўскладнялі атрыманне фінансавання для АГС. Беларускія АГС могуць атрымліваць замежнае фінансаванне толькі для пэўных мэтаў і выключна з папярэдняга ўхвалення дзяржавы. У 2022 годзе АГС адзначылі новыя выклікі, звязаныя з рэгістрацыяй замежных грантаў у Дэпартаменце гуманітарнай дзейнасці. АГС сутыкнуліся са значнымі абмежаваннямі ў атрыманні фінансавання з мясцовых крыніц, што звязана ў тым ліку з законамі аб барацьбе з экстрэмізмам і тэрарызмам. Многія беларусы, якія ахвяравалі сродкі на падтрымку пратэстаў і іншых грамадзянскіх акцый, сутыкнуліся з ціскам і незаконнымі патрабаваннямі прымусова пералічваць сродкі на дзяржаўныя праекты ў памеры, якія ў 10 разоў перавышаюць ахвяраваныя раней сумы. У некаторых выпадках людзей прыцягвалі да крымінальнай адказнасці за фінансаванне «экстрэмісцкай дзейнасці, якая парушае грамадскі парадак».

## ТЭНДЭНЦЫІ Ў ГАЛІНЕ ЎСТОЙЛІВАСЦІ АГС

2022 год быў складаным для ўстойлівага развіцця АГС у дзевяці краінах, ахопленых дадзеным выданнем Індэкса. Ва ўмовах уварвання Расіі ва Украіну, узмацнення рэпрэсій у шэрагу краін і росту інфляцыі, 24 з 63 ацэнак па розных вымярэннях пагоршыліся цягам 2022 года, пры гэтым толькі 6 ацэнак палепшыліся.




Агульная ўстойлівасць АГС змянілася толькі ў трох з дзевяці краін. АГС Беларусі і Расіі адзначаюць зніжэнне ўстойлівасці, у той час як справаздача Украіны сведчыць, што грамадзянская супольнасць стала больш устойлівай, паколькі АГС паспяхова пераадольвалі беспрэцэдэнтныя выклікі 2022 года.

Крытычнае зніжэнне агульнай устойлівасці АГС Расіі за адзін толькі год стала адным з самых рэзкіх спадаў, якія былі зафіксаваныя Індэксам за ўвесь час існавання праекта. Беларускія АГС адзначылі стабільна негатыўную дынаміку ў пагаршэнні сітуацыі. У 2022 годзе і Беларусь, і Расія маюць пагаршэнне па ўсіх сямі паказчыках устойлівасці АГС , пры гэтым сітуацыя з агульнай устойлівасцю пагаршаецца трэці год запар. У абедзвюх краінах дзяржаўныя органы ўсё больш зацята душылі палітычныя свабоды і галасы нязгодных і імкнуліся дыскрэдытаваць АГС. У 2022 годзе АГС мелі меншы доступ да фінансавання і менш магчымасцей удзельнічаць у адвакацыйнай дзейнасці і аказваць паслугі. Акрамя таго, рэпрэсіўная атмасфера вымусіла многія АГС і актывістаў альбо рэлакавацца, альбо знізіць актыўнасць і бачнасць, каб пазбегнуць праследу.

Нягледзячы на складаныя варункі, устойлівасць АГС ва Украіне крыху палепшылася, што адлюстроўвае жыццяздольнасць і адаптыўнасць сектара. АГС прадэманстравалі рост эфектыўнасці па чатырох вымярэннях: фінансавая ўстойлівасць была ўмацавана за кошт значнага павелічэння аб'ёмаў унутранага і знешняга фінансавання; аказанне паслуг палепшылася, паколькі АГС дапамагалі амаль усім групам украінскага грамадства, якія пацярпелі ад вайны; сектаральная інфраструктура пашырылася праз павелічэнне колькасці арганізацый пасярэдніцкай падтрымкі; грамадскі імідж сектара вырас, бо грамадскасць станоўча ацаніла дзейнасць АГС па тэрміновых патрэбах краіны.

Хаця астатнія шэсць краін пакінулі паказчыкі агульнай устойлівасці на леташнім узроўні, у большасці з іх зафіксавана больш негатыўных, чым пазітыўных зменаў. У Венгрыі адзначаліся нязначныя пагаршэнні па чатырох вымярэннях, галоўным чынам, абумоўленыя ўстойлівай антыпатыяй урада да незалежных АГС. Далейшы пераслед незалежных арганізацый прывёў да ўзмацнення неспрыяльных тэндэнцый у прававым асяроддзі, а няспынныя паклёпніцкія кампаніі пагоршылі грамадскі імідж сектара. Фінансавая ўстойлівасць знізілася галоўным чынам праз прадузятасць у размеркаванні дзяржаўных сродкаў, а апатычнасць АГС пасля няўдалай спробы перамагчы кіруючую партыю на нацыянальных выбарах аслабіла іх адвакацыйную дзейнасць.

У Сербіі зафіксаванае зніжэнне ўстойлівасці па двух вымярэннях. Прававое асяроддзе пагаршалася, паколькі АГС і актывісты ўсё часцей траплялі пад пераслед, пагрозы і нават катаванні з боку паліцыі і прыватных ахоўных кампаній, а фінансавая ўстойлівасць зніжалася праз наступствы эканамічнага крызісу. Прававое асяроддзе і фінансавая ўстойлівасць таксама пагоршыліся ў Грузіі, але гэта часткова кампенсавалася нязначным паляпшэннем паказчыка аказання паслуг.

Адзіным вымярэннем устойлівасці, якое змянілася для АГС Польшчы, стала прававое асяроддзе, якое пагоршылася праз прымяненне неспрыяльных законаў і ўвядзенне прававых зменаў, якія могуць негатыўна паўплываць на сектар. У Арменіі працягваў падаць паказчык адвакацыйнай дзейнасці, паколькі нестабільная палітычная сітуацыя і меркаванні нацыянальнай бяспекі спрыялі самацэнзуры і пазбяганню крытыкі ўрада з боку АГС. Пры гэтым усе

астатнія вымярэнні ўстойлівасці засталіся нязменнымі. У Малдове адзіным вымярэннем, па якім зафіксаваныя змены, стала фінансавая ўстойлівасць, якая палепшылася дзякуючы фінансавай падтрымцы донарскіх арганізацый для пераадолення крызісу з уцекачамі.

## ЗАКЛЮЧНАЯ ЧАСТКА

У краінавых справаздачах прадстаўлены паглыблены аналіз стану сектараў АГС у 9 краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі цягам гэтага складанага года. Справаздачы асвятляюць як жыццяздольнасць і адаптыўнасць сектараў АГС у рэгіёне, так і неверагодныя выклікі, з якімі яны сутыкаюцца. Спадзяемся, што дадзенае штогадовае даследаванне зафіксуе тэндэнцыі, карысныя для АГС, урадаў, донараў і даследчыкаў, якія падтрымліваюць развіццё сектара АГС у рэгіёне. Мы хацелі б у чарговы раз падзякаваць нашым шматлікім партнёрам, супрацоўнікам і сябрам, якія рабілі ўнёсак у складанне Індэкса ўстойлівага развіцця АГС Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі за апошнюю чвэрць стагоддзя.

Нягледзячы на тое, што гэтае выданне Індэкса з’яўляецца апошнім, USAID плануе па-ранейшаму адсочваць і падтрымліваць развіццё грамадзянскай супольнасці рэгіёну іншымі спосабамі.

# УСТОЙЛІВАСЦЬ АРГАНІЗАЦЫЙ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ БЕЛАРУСІ - 2022

## АГУЛЬНАЯ ЎСТОЙЛІВАСЦЬ АГС: 6.0 (2021: 5.8)




У лютым 2022 года расійскія войскі пачалі поўнамаштабнае ўварванне ва Украіну з беларускай тэрыторыі. Беларускі ўрад падтрымліваў ваенныя намаганні Расіі таксама іншымі спосабамі, у тым ліку шляхам прысутнасці ў краіне тысяч расійскіх вайскоўцаў і прапановы размяшчэння часткі тактычнай ядзернай зброі Расіі. Статус Беларусі як краіны-агрэсара пагоршыў стаўленне да беларусаў у іншых краінах, што адбілася на дзейнасці арганізацый і актывістаў, якія рэлакаваліся з Беларусі.

У лютым прайшоў рэферэндум, на якім былі ўхваленыя некалькі канстытуцыйных паправак, у тым ліку тыя, якія прадастаўляюць прэзідэнту краіны пажыццёвы імунітэт ад крымінальнага пераследу.

У гэтым складаным кантэксце ўстойлівасць беларускіх АГС зноў знізілася ў 2022 годзе, прычым пагаршэнні былі адзначаныя па ўсіх параметрах устойлівасці. Беларускія ўлады ўзмацнілі пераслед грамадзянскай супольнасці і працягнулі кампанію па ліквідацыі АГС. На працягу года аб’ектамі рэпрэсій сталі праваабаронцы, журналісты, сябры апазіцыйных партый, юрысты, актывісты

прафсаюзаў і АГС, удзельнікі мірных акцый пратэсту. На 31 снежня 2022 года ў Беларусі налічвалася 1446 палітычных зняволеных у параўнанні з 969 на канец 2021 года. Многія актывісты былі вымушаныя пакінуць краіну. У выніку незалежная беларуская грамадзянская супольнасць цяпер у значнай ступені дзейнічае з-за межаў краіны.

Дзяржава яшчэ больш скараціла магчымасць АГС атрымліваць фінансаванне. АГС павінны рэгістраваць усё замежнае фінансаванне ва ўрадзе, перш чым яго атрымаць. У многіх выпадках урад успрымае фінансаванне грамадскай дзейнасці як фінансаванне экстрэмізму, тэрарызму і масавых беспарадкаў, што ўскладняе атрыманне замежных сродкаў. Чыноўнікі і дзяржаўныя СМІ дыскрэдытуюць АГС і выкарыстоўваюць супраць іх мову варожасці. Акрамя таго, беларускія ўлады робяць крокі па замене незалежных АГС і іх дзейнасці арганізацыямі, якія кантралююцца дзяржавай.

У выніку ціску многія АГС сталі менш актыўнымі і менш публічнымі, што негатыўна паўплывала на іх доступ да мэтавых груп і прыхільнікаў. Арганізацыі, якія працуюць у Беларусі, дзейнічаюць у вельмі рызыкоўным асяроддзі і адзначаюць, што планаваць можна толькі на некалькі месяцаў наперад. Надзвычай цяжкія ўмовы працы прывялі да моцнага стрэсу і выгарання вялікай колькасці прадстаўнікоў АГС, і многія пакінулі сектар.

Калі пачалася вайна, многія актывісты, а ў некаторых выпадках і цэлыя арганізацыі, пачалі аказваць дапамогу ўкраінскім уцекачам, весці інфармацыйную працу пра вайну, арганізоўваць акцыі салідарнасці. Антываенныя выступленні ў краіне былі жорстка падаўленыя. 27 лютага, напрыклад, прынамсі 900 чалавек былі затрыманыя за пратэст супраць расійскага ўварвання ва Украіну і канстытуцыйнага рэферэндуму. Да лета 2022 года большасць АГС у сваёй дзейнасці вярнуліся да «даваеннага» парадку дня.

На 1 студзеня 2023 года ў Беларусі зарэгістраваныя 2544 грамадскія аб'яднанні (у тым ліку 213 міжнародныя, 668 рэспубліканскіх і 1663 мясцовыя), 20 прафесійных саюзаў і 44 саюзы грамадскіх аб'яднанняў. Гэтыя лічбы меншыя ў параўнанні з мінулым годам, калі было зарэгістравана 2978 грамадскіх аб'яднанняў, 25 прафсаюзаў і 45 саюзаў грамадскіх аб'яднанняў. Аднак нават гэтыя лічбы перабольшаныя, бо большасць АГС, якія былі ліквідаваныя ў 2021-

2022 гадах, дагэтуль не выключаныя са статыстыкі. У адрозненне ад мінулых гадоў у бягучай статыстыцы Мінюста адсутнічаюць звесткі аб колькасці зарэгістраваных фондаў і колькасці новых грамадскіх аб'яднанняў, якія паўсталі ў 2022 годзе. Інфармацыя пра колькасць зарэгістраваных у краіне некамерцыйных арганізацый і аб'яднанняў юрыдычных асоб адсутнічае на працягу многіх гадоў. Шматлікія беларускія АГС працягваюць працаваць з эміграцыі ў Літве, Польшчы, Грузіі, Чэхіі і іншых краінаў.

## ПРАВАВОЕ АСЯРОДДЗЕ: 7.0 (2021: 7.0)




У 2022 годзе прававое асяроддзе, у якім працуюць беларускія АГС, нязначна пагоршылася. Аднак, паколькі адзнака за 2021 год ужо была найгоршай з магчымых па шкале Індэкса ўстойлівасці АГС, бал застаецца нязменным.

Папраўкі да Канстытуцыі, зацверджаныя ў лютым, паўплывалі на АГС па-рознаму. У новай Канстытуцыі ўпершыню згадваецца тэрмін «грамадзянская супольнасць», хоць і не вызначаецца гэтае паняцце. Юрыдычнае вызначэнне свабоды асацыяцый стала больш абмежаваным, паколькі канстытуцыйныя змены вызначылі канкрэтныя мэты, пад якія могуць ствараецца НДА. Акрамя таго, грамадскія аб'яднанні больш не маюць права вылучаць кандыдатаў на палітычныя пасады.

Змены ў Канстытуцыі таксама выклікалі неабходнасць унесці папраўкі ў законы, звязаныя з АГС, а таксама прыняць новыя законы. Праект закону «Аб асновах грамадзянскай супольнасці», які быў прыняты ў першым чытанні ў снежні 2022 года, накіраваны на стварэнне іерархіі АГС на аснове іх супрацоўніцтва з дзяржавай і прасоўвання «ўласнай» дзяржаўнай грамадзянскай супольнасці. Закон «Аб Усебеларускім народным сходзе» робіць Усебеларускі народны сход «вышэйшым прадстаўнічым органам улады народа Рэспублікі Беларусь, які

вызначае стратэгічныя напрамкі развіцця грамадства і дзяржавы, забяспечвае непарушнасць канстытуцыйнага ладу, пераемнасць пакаленняў і грамадзянскую згоду». Тэарэтычна, Усебеларускі народны сход уключае ў сябе прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці і ўпершыню дае ім магчымасць удзельнічаць у прыняцці дзяржаўных рашэнняў. На практыцы, аднак, гэты інстытут яшчэ больш умацоўвае праўрадавыя АГС у параўнанні з незалежнай грамадзянскай супольнасцю.

У 2022 годзе рэпрэсіі супраць беларускіх АГС узмацніліся. Ціск прымаў розныя формы, уключаючы праверкі, пісьмовыя папярэджанні, прыпыненне дзейнасці, адміністрацыйную і крымінальную адказнасць кіраўнікоў, супрацоўнікаў, сябраў і валанцёраў АГС, ціск на сваякоў і блізкіх тых, хто звязаны з АГС,ператрусы, прымусовую ліквідацыю і самаліквідацыю, блакаванне доступу да сайтаў, прызнанне інфармацыйных матэрыялаў і саміх арганізацый экстрэмісцкімі, паклёп у СМІ. Многія прадстаўнікі АГС, у тым ліку сем актывістаў праваабарончых арганізацый, напрыканцы 2022 года знаходзіліся ў зняволенні або пад вартай. На працягу года супраць незалежных прафсаюзаў пачаліся розныя формы рэпрэсій, у тым ліку крымінальныя пераследы актывістаў і прымусовая ліквідацыя. Акрамя таго, пачалася распрацоўка новага закону, які прадугледжвае перарэгістрацыю ўсіх палітычных партый у краіне.

Дзяржаўная кампанія па ліквідацыі АГС, якая пачалася ў сярэдзіне 2021 года, закранула сотні АГС. Агулам у 2021 і 2022 гадах, як паведамляе Lawtrend, былі гвалтоўна ліквідаваныя 757 АГС (у тым ліку 451 толькі ў 2022 годзе), і яшчэ 416 АГС вырашылі ліквідавацца самастойна.

У студзені 2022 года парламент Беларусі прыняў закон, які аднаўляе крымінальную адказнасць за арганізацыю або ўдзел у дзейнасці незарэгістраванай АГС (арт. 193-1 Крымінальнага кодэкса). Закон уступіў у сілу ў тым жа месяцы. Артыкул 193-1 прадугледжвае пакаранне да двух гадоў пазбаўлення волі. Па гэтым артыкуле ў 2022 годзе былі ўзбуджаныя як мінімум дзве крымінальныя справы: адна ў дачыненні да былой кіраўніцы дабрачыннай ГА «Гродзенскі дзіцячы хоспіс» і другая ў дачыненні да службовых асоб ТАА «Клерыгата», якое, на думку абвінавачання, пераследвала мэты і задачы незарэгістраванага Саюза палякаў.

Таксама заканадаўча замацоўваюцца рэпрэсіўныя практыкі супраць грамадскага актывізму. Напрыклад, былі ўведзеныя нормы аб «спецыяльным судаводстве», якія дазваляюць праводзіць завочныя суды над актывістамі, якія лі з’ехалі з краіны.  Напрыканцы 2022 года ў дачыненні да 17 чалавек завочна вяліся такія спецсудаводствы. Экс-кіраўніца Беларускага фонду спартовай салідарнасці Аляксандра Герасіменя і выканаўчы дырэктар фонду Аляксандар Апейкін былі асуджаныя на 12 гадоў пазбаўлення волі. Акрамя таго, у закон аб грамадзянстве былі ўнесены змены, якія дазваляюцьануляваць грамадзянства, набытае па нараджэнні.

Заканадаўства аб барацьбе з экстрэмізмам, адмываннем грошай, даходамі, атрыманымі злачынным шляхам, і супрацьдзеянні тэрарызму шырока выкарыстоўваецца супраць АГС, а таксама іх кіраўніцтва, супрацоўнікаў, сябраў, валанцёраў і актывістаў. На аснове гэтага заканадаўства праводзяцца праверкі, блакаванне сайтаў, ліквідацыя арганізацый і крымінальны пераслед асобаў, звязаных з АГС. Экстрэмісцкімі былі прызнаныя як зарэгістраваныя ў Беларусі арганізацыі, такія як «Экадом» і Беларускі незалежны прафсаюз РЭП, так і зарэгістраваныя за мяжой, у тым ліку Прафесійны саюз беларусаў Брытаніі і арганізацыя «Дапамога». На канец 2022 года не менш як 83 чалавекі былі асуджаныя за стварэнне, кіраўніцтва або далучэнне да экстрэмісцкіх фармаванняў з мэтай здзяйснення злачынстваў экстрэмісцкага характару, прадастаўленне або збор сродкаў для іх, або аказанне іншага садзейнічання экстрэмісцкай дзейнасці. Гэтыя рэпрэсіўныя метады з'яўляюцца яскравым прыкладам злоўжывання міжнароднымі стандартамі па барацьбе з адмываннем грошай і фінансаваннем тэрарызму для абмежавання, пазбаўлення рэсурсаў і голасу грамадзянскай супольнасці.

Разам з тым у 2022 годзе былі ўнесеныя пазітыўныя змены ў заканадаўства. Так, у першым чытанні парламент прыняў папраўкі ў два законы — «Аб дзяржаўнай падтрымцы моладзевых грамадскіх аб'яднанняў» і «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні», якія дазваляюць фінансаванне незарэгістраваных АГС. Але з улікам аднаўлення крымінальнай адказнасці за ўдзел у дзейнасці незарэгістраваных арганізацый відавочна, што гэтыя нормы распрацоўваюцца

ў першую чаргу на карысць праўладных АГС і арганізацый, дзейнасць якіх адпавядае дзяржаўнай ідэалёгіі.

Рэгістрацыя АГС па-ранейшаму застаецца складанай і суб'ектыўнай. Няма інфармацыі аб тым, колькі новых АГС зарэгістравана ў 2022 годзе. Дзяржаўныя органы могуць выкарыстоўваць шырокія прававыя падставы для адмовы ў рэгістрацыі, і заяўкі на рэгістрацыю АГС звычайна не ўхваляюцца.

Доступ да ўнутранай і замежнай дапамогі быў істотна скарочаны для тых АГС, якія засталіся ў краіне. АГС могуць афіцыйна атрымліваць замежную дапамогу толькі на вузкі пералік дазволеных мэтаў, які не ўключае правы чалавека, гендарную роўнасць і многія іншыя віды дзейнасці АГС. АГС павінны зарэгістраваць дапамогу ва ўрадзе і заплаціць зборы перад яе выкарыстаннем. На практыцы праекты, якія прыцягнулі замежнае фінансаванне, атрымліваюць адмову ў яго рэгістрацыі, хаця ў заканадаўстве дакладных падставаў для гэтага няма. Прадстаўнікі незалежных прафсаюзаў былі прыцягнутыя да адміністрацыйнай адказнасці за парушэнне парадку выкарыстання замежнай бязвыплатнай дапамогі.

Калі фонды або ўстановы займаюцца прадпрымальніцкай дзейнасцю, даход ад такой дзейнасці падлягае падаткаабкладанню па тых жа стаўках, што і даход камерцыйнай кампаніі. Грамадскім аб'яднанням забаронена займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю. Разам з тым у прынятых у 2022 годзе папраўках у закон «Аб грамадскіх аб'яднаннях» гаворыцца, што грамадскія аб'яднанні могуць выконваць работы і аказваць паслугі ў рамках дзяржаўнай сацыяльнай замовы без стварэння камерцыйных арганізацый і ўдзелу ў іх. Аднак умовы тэндэраў на дзяржаўныя закупкі звычайна фармулююцца неспрыяльна для ўдзелу АГС. У законе не ўдакладняецца ні асобны грамадскі статус, ні паняцце сацыяльнага прадпрымальніцтва.

Напрыканцы 2022 года ў Падатковы кодэкс былі ўнесеныя змены, якія ўступілі ў сілу ў пачатку 2023 года. Яны абмяжоўваюць падатковыя адлічэнні і ліквідуюць ранейшую магчымасць для АГС, якія не ажыццяўляюць прадпрымальніцкую дзейнасць, падаваць дэкларацыі на папяровым носьбіце. У выніку многія арганізацыі будуць вымушаныя рэгістравацца ў сістэме электроннага дэкларавання, што накладвае дадатковую фінансавую нагрузку.

Падатковы кодэкс вызначае пералік з 17 арганізацый, якім спонсарская дапамога АГС дае права на падатковыя льготы. Гэтыя ахвяраванні павінны быць афармлены пісьмовай дамовай з атрымальнікам. Падатковая сістэма не прадугледжвае стымулаў для прадпрыемстваў і фізічных асоб, якія аказваюць дабрачынную дапамогу. Больш за тое, кантралюючыя органы і падатковыя інспекцыі часам разглядаюць прадастаўленне ахвяраванняў АГС, якія не ўваходзяць у адмысловы спіс Падатковага кодэкса, як патэнцыйную рызыку, якая патрабуе дадатковых праверак.

За апошнія некалькі гадоў доступ АГС да юрыдычнай дапамогі значна скараціўся. У выніку ціску (у 2022 годзе 16 адвакатаў былі затрыманыя і 58 пазбаўленыя ліцэнзіі) адвакаты адмаўляюцца працаваць па «палітычных» справах, у тым ліку па гвалтоўнай ліквідацыі АГС і прызнанні іх экстрэмісцкімі. Рэпрэсіі ў дачыненні да арганізацый, якія традыцыйна аказваюць бясплатную юрыдычную дапамогу АГС, і засцярога некаторых АГС унутры краіны наўпрост звяртацца па юрыдычную кансультацыю, таксама спрыялі зніжэнню даступнасці юрыдычных паслуг.

## АРГАНІЗАЦЫЙНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ: 5.3 (2020: 5.1)

Арганізацыйны патэнцыял беларускіх АГС у 2022 годзе нязначна пагоршыўся з-за працягу ліквідацыі і рэлакацыі арганізацый, рэпрэсій, прызнання АГС «экстрэмісцкімі фармаваннямі», выгарання і кадравага крызісу ў сектары.




Працягвае павялічвацца разрыў паміж АГС унутры краіны і тымі, што рэлакаваліся. Згодна з абнаўленнем даследавання «Стан і бягучыя патрэбы арганізацый грамадзянскай супольнасці Беларусі ў сітуацыі палітычнага крызісу», праведзенага SYMPA/BIPART, геаграфічнае знаходжанне АГС і іх прадстаўнікоў вызначае «розныя парадкі дня, розныя ацэнкі сітуацыі і розныя ацэнкі рызык».

У 2022 годзе АГС мелі меншы доступ да сваіх прыхільнікаў, валанцёраў і мэтавых груп. Шмат арганізацый спынілі актыўна і сістэмна працаваць па прыцягненні прыхільнікаў, закрылі свае сайты і старонкі ў сацыяльных сетках, а таксама ладзілі менш масавых мерапрыемстваў. Патэнцыйныя валанцёры і сябры баяцца далучацца да АГС з-за пагрозы пераследу. Толькі арганізацыі, створаныя дзяржавай ці якія падтрымліваюцца дзяржавай, адкрыта працуюць са сваімі сябрамі і прыхільнікамі.

Шэраг даследаванняў паказвае, што стратэгічнае планаванне застаецца выклікам для АГС. Большасць АГС, якія ўдзельнічалі ў апытанні «Стан беларускіх АГС», праведзеным праваабарончай арганізацыяй Lawtrend у снежні 2022 года, адзначылі кароткія тэрміны планавання: 45% АГС плануюць сваю дзейнасць на адзін-два гады і 19% — на палову года ці менш. У адказ на пачатак вайны ва Украіне многія арганізацыі скарэктавалі свае прыярытэты і стратэгіі, алезастаюцца адданымі сваёй місіі. Паводле даследаваньня Lawtrend, 97% рэлакаваных АГС працягваюць сваю дзейнасць на карысць Беларусі.

Цягам года АГС сталі больш клапаціцца аб унутраным кіраванні і аперацыйных працэдурах, распрацавалі палітыкі камунікацыі, бяспекі, фінансавага кіравання, а таксама этычныя прынцыпы. У той жа час належнае дэмакратычнае кіраванне і развіццё кіруючых органаў не былі прыярытэтам для большасці АГС. У шмат якіх нядаўна створаных АГС няма падзелу абавязкаў паміж кіруючымі органамі і супрацоўнікамі. Органы кіравання часта проста сімвалічныя або існуюць толькі на паперы.

На працягу 2022 года АГС працягвалі рэлакавацца з Беларусі ў іншыя краіны. Некаторыя АГС і іх каманды мусілі пераехаць у новую краіну ў 2022 годзе, пакінуўшы зону ваенных дзеянняў ва Украіне. Супрацоўнікі АГС і валанцёры, якія застаюцца ў Беларусі, працуюць у надзвычай рызыкоўных умовах, дзе сутыкаюцца з ціскам і пагрозамі пераследу. Нягледзячы на тое, што рэлакаваныя АГС могуць легальна наймаць супрацоўнікаў, многія з іх па-ранейшаму не заключаюць працоўных кантрактаў, паколькі гэта даражэй, а таксама з-за адсутнасці культуры забеспячэння працоўных і сацыяльных гарантый для сваіх супрацоўнікаў.

Складаныя ўмовы працы на фоне рэпрэсій, рэлакацыі, стрэсаў і нявызначанасці сталі прычынай выгарання многіх прадстаўнікоў АГС. Паводле даследавання, праведзенага незалежнай лабараторыяй Civic Leverage у красавіку-траўні 2022 года, 53% беларускіх актывістаў адзначаюць праблемы са здароўем з прычыны сваёй працы ў сектары. Шмат дасведчаных кіраўнікоў і высокакваліфікаваных спецыялістаў пакінулі сектар. У той жа час АГС даволі складана знаходзіць новых кампетэнтных супрацоўнікаў, што сведчыць аб кадравым крызісе ў беларускім сектары АГС.

Тэхнічнае забеспячэнне АГС у 2022 годзе пагоршылася з-за двух фактараў. Па-першае, падчасператрусаў у офісах арганізацый і на кватэрах супрацоўнікаў была канфіскаваная тэхніка. Па-другое, у выніку санкцый супраць Беларусі як краіны-агрэсара ў вайне ва Украіне беларускія АГС страцілі доступ да часткі праграмнага забеспячэння, IT-інструментаў і сэрвісаў, такіх як TechSoup, які дае некамерцыйным арганізацыям доступ да ахвяраванняў і зніжак на праграмнае забеспячэнне і паслугі ад буйных кампаній.

## ФІНАНСАВАЯ ЎСТОЙЛІВАСЦЬ: 6,7 (2021: 6.6)




Фінансавая ўстойлівасць беларускіх АГС у 2022 годзе крыху пагоршылася на фоне няспыннага ўзмацнення негатыўных тэндэнцый 2020-2021 гадоў. Доступ АГС да фінансавых крыніц быў абмежаваны як строгім заканадаўствам, так і новымі жорсткімі санкцыямі за яго парушэнне.

АГС сутыкаюцца з абмежаваннямі ў доступе да ўнутранага і замежнага фінансавання. Як было сказана вышэй, АГС у Беларусі могуць атрымліваць замежнае фінансаванне толькі на пэўныя мэты і павінны для гэтага атрымаць папярэднюю згоду з боку дзяржавы. Нягледзячы на тое, што істотных зменаў у заканадаўстве адносна замежнай дапамогі ў 2022 годзе не адбылося, АГС

паведамляюць пра ўзмацненне выклікаў з рэгістрацыяй замежных грантаў у Дэпартаменце гуманітарнай дзейнасці.

Паводле Дэпартамента гуманітарнай дзейнасці, у 2022 годзе Беларусь атрымала замежную бязвыплатную дапамогу на суму 87,41 млн даляраў, сярод краін-донараў — Расія і ЗША. Гэта менш за $102 млн, атрыманых у 2021 годзе, і $91,04 млн, атрыманых у 2020 годзе. Аб'ём зарэгістраванай замежнай дапамогі з боку ЗША ў 2022 годзе знізіўся да $17,36 млн, што складае 55,8% ад узроўню 2021 года.

У верасні 2022 года ўрад перакваліфікаваў крымінальную справу супраць ПЦ «Вясна» з падатковага злачынства на кантрабанду. Згодна з новым абвінавачаннем, грошы, легальна ўвезеныя ў Беларусь у перыяд з 2016 па 2021 год для дзейнасці арганізацыі, прызнаныя кантрабандай. У сакавіку 2023 года чацвёра кіраўнікоў ПЦ «Вясна», у тым ліку лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру 2022 года Алесь Бяляцкі, былі асуджаныя на працяглыя тэрміны зняволення ад сямі да дзесяці гадоў за кантрабанду і фінансаванне дзеянняў, якія парушаюць грамадскі парадак. Гэта дэманструе новы і яшчэ больш жорсткі метад блакіроўкі АГС што тычыцца атрымання замежнага фінансавання. Замежная і міжнародная дабрачынная дапамога і яе атрымальнікі звычайна ачарняюцца ў дзяржаўных СМІ.

Беларускія АГС, якія рэлакаваліся ў краіны з больш спрыяльнымі ўмовамі доступу да фінансавых рэсурсаў, таксама сутыкнуліся з некаторымі абмежаваннямі, якія паўплывалі на іх фінансавую ўстойлівасць. Напрыклад, банкаўскія рахункі большасці беларускіх актывістаў ва Украіне былі замарожаныя пасля пачатку вайны. АГС, заснаваныя беларусамі ў Грузіі, таксама сутыкнуліся з цяжкасцямі з адкрыццём банкаўскіх рахункаў. Улічваючы санкцыі, уведзеныя ЗША, Еўрапейскім Звязам і іншымі краінамі супраць Беларусі, беларускія АГС разглядаюцца банкамі як рызыкоўныя кліенты, што часта прыводзіць да адмовы ў абслугоўванні.

АГС сутыкаюцца са значнымі абмежаваннямі ў атрыманні фінансавання з унутраных крыніц, у тым ліку на падставе барацьбы з «экстрэмізмам» і «тэрарызмам». Многія беларусы, якія ахвяравалі сродкі на падтрымку пратэстаў і іншых грамадскіх дзеянняў, сутыкнуліся з ціскам, у тым ліку з

патрабаваннямі пералічыць у дзесяць разоў большыя сумы на дзяржаўныя праекты. У шэрагу выпадкаў актывісты прыцягваліся да крымінальнай адказнасці за фінансаванне экстрэмісцкай дзейнасці, якая парушае грамадскі парадак. Так, восенню 2022 года медыяменеджэр Андрэй Аляксандраў быў асуджаны на чатырнаццаць гадоў пазбаўлення волі за аплату паслуг адвакатаў і фінансавую дапамогу ўдзельнікам пратэстаў у 2020 годзе. Акрамя таго, масавае пазбаўленне рэгістрацыі АГС абмежавала іх доступ да рэсурсаў, таму што незарэгістраваным арганізацыям забаронена весці любую дзейнасць у Беларусі, у тым ліку збор сродкаў, а бізнесы асцерагаюцца падтрымліваць незарэгістраваныя арганізацыі. Улічваючы такую практыку, многія арганізацыі свядома прыпынілі свае кампаніі па зборы сродкаў у краіне.

У многіх АГС, у офісах якіх летам 2021 года прайшліператрусы, пасля былі заблакаваныя банкаўскія рахункі. У снежні 2022 года Міністэрства інфармацыі заблакавала доступ да краўдфандынгавай платформы Patreon у Беларусі.

У краіне па-ранейшаму адсутнічае канкурэнтная сістэма дзяржаўнага фінансавання АГС. Пры гэтым у 2022 годзе былі распрацаваныя два законы, якія запускаюць новыя механізмы конкурснага дзяржаўнага фінансавання мясцовых і моладзевых ініцыятыў. Абодва механізмы дазволяць фінансаваць незарэгістраваныя ініцыятывы, а таксама зарэгістраваныя арганізацыі. Падобна на тое, што гэтыя механізмы будуць карысныя толькі праўладным АГС і арганізацыям, дзейнасць якіх адпавядае дзяржаўнай ідэалогіі.

Новыя палажэнні, унесеныя ў заканадаўства напрыканцы 2021 года, пашырылі пералік інфармацыі, якую грамадскія аб'яднанні і фонды павінны ўключаць у публічную справаздачнасць. Напрыклад, АГС павінны прадастаўляць падрабязную інфармацыю аб паступленні сродкаў і іншых актываў, аб замежных і міжнародных донарах, аб'ёмах сродкаў і канкрэтных актывах. Істотна змяніліся і патрабаванні да прадастаўлення звестак аб выдаткаванні грашовых сродкаў і іншых актываў. Грамадскія аб'яднанні і фонды павінны даваць справаздачу аб агульным аб'ёме выдаткаў і выкарыстанні сродкаў і іншых актываў асобна па кожным артыкуле выдаткаў. Фонды і грамадскія аб'яднанні павінны былі падаць такую справаздачу за мінулы год да 1 сакавіка 2022 года.

## АДВАКАТАВАННЕ: 6.1 (2021: 5.8)




Адвакатаванне ў 2022 годзе значна пагоршылася, бо каналаў камунікацыі і ўзаемадзеяння з дзяржаўнымі органамі і іх прадстаўнікамі амаль не было.

Беларускія АГС у 2022 годзе не праводзілі адвакатыўныя кампаніі па змене заканадаўства нават у адказ на прынятыя ўладамі законы аб грамадскіх аб'яднаннях і асновах грамадзянскай супольнасці. У дыскусіях удзельнічалі толькі АГС, блізкія да дзяржавы і ГОНГА. Пашырэнне практыкі прыняцця нарматыўных актаў без публікацыі іх зместу зрабіла немагчымым адвакатаваць змены ў заканадаўстве, бо АГС проста не ведалі, што прапануецца. Колькасць нарматыўных актаў, вынесеных на грамадскае абмеркаванне, і колькасць атрыманых каментарыяў да іх скарацілася са 195 праектаў і 7500 каментарыяў у 2020 годзе да 133 праектаў і 880 каментарыяў у 2022 годзе. Колькасць калектыўных зваротаў праз платформу Petitions.by таксама зменшылася з 400 у 2021 годзе да менш чым 370 у 2022 годзе.

Пасля прыняцця ў чэрвені абноўленага Закона «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб» АГС былі вымушаныя рэгістравацца ў адмысловай сістэме на сайце обращения.бел, каб мець зносіны з дзяржаўнымі органамі праз электронныя звароты. Ліквідаваныя АГС, а таксама арганізацыі, прызнаныя экстрэмісцкімі фармаваннямі, не могуць зарэгістравацца ў гэтай сістэме і, такім чынам, выключаныя з камунікацыі з дзяржаўнымі органамі.

У сувязі з кампаніяй па ліквідацыі прадстаўніцтва АГС у беларускіх адвакатыўных органах, такіх як назіральныя і грамадскія рады, скарацілася. Ліквідаваныя ў Беларусі арганізацыі таксама сутыкнуліся з цяжкасцямі ў адвакатаванні на міжнародным узроўні. Напрыклад, пасля ліквідацыі экалагічная АГС «Экадом» была пазбаўленая магчымасці ўдзельнічаць у Еўрапейскім экафоруме, а таксама ў іншых мерапрыемствах у Бруселі і Жэневе.

У 2022 годзе ўрад увёў крымінальную адказнасць за любыя заклікі да санкцый супраць Беларусі. Шырокія азначэнні дазволілі ўладам расцаніць любыя звароты ў міжнародныя структуры, якія прыводзяць да ўвядзення санкцый у дачыненні да Беларусі, як шкоду нацыянальнай бяспецы, што зрабіла міжнароднае адвакатаванне рызыкоўным для АГС унутры краіны.

У 2022 годзе Беларусь спыніла ўдзел у Орхускай канвенцыі — міжнароднай дамове, якая дае людзям права на доступ да інфармацыі пра навакольнае асяроддзе, тым самым абмяжоўваючы рамкі для адвакатавання па гэтай тэме. Акрамя таго, Беларусь дэнансавала Факультатыўны пратакол да Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, пазбавіўшы беларусаў магчымасці звяртацца са скаргамі ў Камітэт па правах чалавека ААН. Паколькі Беларусь не падпадае пад юрысдыкцыю Еўрапейскага суда па правах чалавека, Камітэт па правах чалавека ААН быў адзінай пляцоўкай, дзе беларусы маглі адстойваць свае правы на міжнародным узроўні.

Тым не менш, рэлакаваныя беларускія АГС актыўна займаліся міжнародным адвакатаваннем. У прыватнасці, Камітэт ААН па правах чалавека і спецдакладчык ААН па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі апублікавалі даклады, у якіх адзначаліся праблемы з правамі чалавека ў краіне і змяшчаліся рэкамендацыі па паляпшэнні сітуацыі. АГС паспяхова выступалі за ўключэнне ў гэтыя справаздачы рэкамендацый аб неабходнасці прызнання міжнароднымі арганізацыямі і міжнароднай супольнасцю рэлакаваных беларускіх АГС і ўзаемадзеяння з імі, нягледзячы на іх ліквідацыю ў Беларусі. Так, Беларускі Хельсінскі Камітэт быў ліквідаваны ўрадам, але ў 2022 годзе арганізацыя атрымала кансультатыўны статус пры Эканамічнай і сацыяльнай радзе ААН.

Насуперак рэпрэсіям, у Беларусі развіваецца падпольны рух салідарнасці з Украінай. Актывісты ўнутры краіны пашыраюць самвыдат на антываенную тэматыку і ствараюць антываенныя графіці. Пра перамяшчэнне расійскіх войскаў грамадзяне паведамляюць у тэлеграм-канале «Беларускі гаюн», на які прыходзіць каля 1000 паведамленняў за дзень. АГС «Сумленныя людзі» публікуе штотыднёвы дайджэст і распаўсюджвае яго ў Беларусі, каб узброіць актывістаў інфармацыяй і прапановамі, як ціснуць на мясцовыя саветы і дэпутатаў парламента ў сувязі з вайной ва Украіне.

## АКАЗАННЕ ПАСЛУГАЎ: 5.5 (2021: 5.3)




У 2022 годзе на аказанне паслуг беларускімі АГС яшчэ больш паўплывала эскалацыя рэпрэсій супраць грамадзянскай супольнасці і развязванне поўнамаштабнай вайны паміж Расіяй і Украінай.

Паводле даследавання «Стан беларускіх АГС», праведзенага Lawtrend, найбольш пашыранымі сферамі дзейнасці АГС з'яўляюцца асветніцкая і інфармацыйная дзейнасць (62%), развіццё грамадзянскай супольнасці (48%), абарона правоў чалавека (40%), культура і мастацтва (29%), а таксама мясцовае развіццё і ўрбаністычныя даследаванні (25%).

У 2022 годзе АГС арганізавалі шмат культурных мерапрыемстваў, такіх як паэтычныя чытанні і выставы. АГС таксама прапанавалі шырокі спектр паслуг для падтрымкі палітвязняў і іх сем'яў. У той жа час рэпрэсіі прывялі да зніжэння попыту на асобныя паслугі, напрыклад, юрыдычную дапамогу. Некаторыя арганізацыі, якія працуюць з уразлівымі групамі, напрыклад, з людзьмі, якія жывуць з ВІЧ, і людзьмі з псіхічным разладам, працягвалі працаваць адкрыта.

Прымусовая ліквідацыя арганізацый прывяла да скарачэння колькасці і разнастайнасці паслуг АГС, асабліва тых, што аказваюцца непасрэдна на тэрыторыі Беларусі. Так, у сакавіку 2022 года ліквідавалі грамадскае аб'яднанне «Радзіслава», таму яно больш не можа аказваць паслугі ахвярам хатняга гвалту. Аналагічным чынам ліквідацыя незалежных прафсаюзаў цягам года стала вынікам таго, што сацыяльная і прававая дапамога, інфармацыйныя і адукацыйныя паслугі, якія яны аказвалі, сталі недаступныя. Цягам года не праводзіліся адкрытыя адукацыйныя і інфармацыйныя імпрэзы, кінафестывалі. Некаторыя АГС, асабліва праваабарончыя, былі прызнаныя «экстрэмісцкімі фармаваннямі», або такімі прызнаваліся іх матэрыялы. У выніку інфармацыйныя рэсурсы гэтых арганізацый былі заблакаваныя ўнутры краіны.

АГС — якія працуюць у Беларусі і якія рэлакаваліся — у 2022 годзе працягвалі пераводзіць свае паслугі ў анлайн-фармат. Мэтавыя групы і супольнасці мелі доступ да курсаў і вэбінараў па грамадзянскай адукацыі, самаклопаце, развіцці супольнасцяў, фінансавай устойлівасці і іншых тэмах. АГС працягнулі распрацоўку аўтаматызаваных чат-ботаў для прадастаўлення інфармацыйных і кансультацыйных паслуг. Напрыклад, чат-бот @Green_phone_bot, створаны ў 2022 годзе, дапамагае вырашаць экалагічныя праблемы ў Беларусі і дае алгарытмы інтэрвенцый і ўзоры зваротаў па розных пытаннях. Рост анлайн-сервісаў зрабіў іх больш даступнымі для актыўнай інтэрнэт-аўдыторыі, напрыклад, для моладзі. Аднак іншыя групы, такія як людзі сталага ўзросту і жыхары сельскай мясцовасці, сутыкнуліся з праблемамі з-за абмежаванага доступу да інтэрнэту або адсутнасці тэхнічных навыкаў.

АГС, якія ўсё яшчэ працуюць у Беларусі, у асноўным аказвалі паслугі мясцовым супольнасцям і пэўным мэтавым групам. Каб захаваць сваю бяспеку, АГС часта верыфікуюць патэнцыйных удзельнікаў, перш чым даць ім доступ да адукацыйных праграм. Напрыклад, ініцыятыўная група, якая працуе з супольнасцю ЛГБТКІ+, закрыла свае акаўнты ў сацыяльных сетках, правяла верыфікацыю падпісчыкаў і анансавала офлайн-мерапрыемствы ў Беларусі толькі ў бяспечных месцах. Гэтыя захады бяспекі перашкодзілі ўдзелу ў мерапрыемствах некаторым прадстаўнікам мэтавай групы.

Рэлакаваныя АГС звярталіся да больш шырокай аўдыторыі, захоўваючы пры гэтым фокус на беларусах. З пачаткам вайны некаторыя арганізацыі, асабліва тыя, што пераехалі ў Польшчу, часова пераключылі сваю ўвагу на дапамогу ўкраінскім уцекачам. Праз некалькі месяцаў, калі плыня ўцекачоў зменшылася, большасць АГС вярнуліся да сваёй звычайнай дзейнасці. Некаторыя рэлакаваныя арганізацыі працягвалі аказваць паслугі, накіраваныя на дапамогу Украіне, як частку сваёй бягучай працы. Напрыклад, такія АГС, як Беларускі фонд салідарнасці BYSOL, Free Belarus Center, «Разам» і тэлеграм-канал «Рух Большасці», ладзілі кампаніі па зборы сродкаў у падтрымку Украіны і дасылалі лекі і іншыя неабходныя рэчы.

Складаны палітычны кантэкст у 2022 годзе яшчэ больш скараціў доступ АГС да сваіх прыхільнікаў, што стала асаблівай праблемай для рэлакаваных АГС. Тым

не менш, АГС цягам года павялічвалі намаганні па вызначэнні патрэб сваіх мэтавых груп, галоўным чынам, праз анлайн-апытанні.

АГС не мелі магчымасці прасоўваць свае паслугі праз дзяржаўныя СМІ. Акрамя таго, урад увёў 20% плату за рэкламу ў СМІ ў Беларусі, а незалежныя медыя былі зачыненыя або прызнаныя «экстрэмісцкімі». У выніку скарацілася колькасць артыкулаў пра АГС, што ўскладніла арганізацыям абмен інфармацыяй са сваімі мэтавымі групамі. У адказ АГС кантактавалі са сваімі мэтавымі групамі праз сацыяльныя сеткі, часта выкарыстоўваючы прыватныя акаўнты.

АГС у Беларусі з-за іх прававога статусу маюць абмежаваныя магчымасці кампенсаваць выдаткі за кошт аказання платных паслуг, паколькі ліквідаваныя арганізацыі не могуць атрымліваць плацяжы і ахвяраванні. Некаторыя арганізацыі пачалі рэгістравацца ў якасці камерцыйных суб'ектаў і аказваць паслугі альбо па рынкавых стаўках, альбо па стаўках, якія часткова кампенсуюць іх выдаткі. Напрыклад, некаторыя АГС арганізоўвалі платныя экскурсіі, адукацыйныя анлайн-курсы і афлайн-майстар-класы, накіраваныя на развіццё пэўных навыкаў.

Дзяржава працягвала праводзіць мэтанакіраваную паклёпніцкую кампанію супраць АГС і іх дзейнасці. Мясцовыя і нацыянальныя ўлады не прызнаюць каштоўнасці, якую незалежныя АГС могуць дадаць у аказанні сацыяльных паслуг, або робяць гэта выключна дэкларатыўна. У 2022 годзе, хоць і ў вельмі абмежаванай форме, але працягвалася дзяржаўная замова сацыяльных паслуг АГС.

## ІНФРАСТРУКТУРА СЕКТАРА: 5.5 (2021: 5.3)

Інфраструктура, якая падтрымлівае беларускі сектар АГС, у 2022 годзе працягвала пагаршацца. Цяпер інфраструктура сектара цалкам размешчана за межамі краіны, а арганізацыі, якія працягваюць працаваць у Беларусі, маюць абмежаваны доступ да іх паслуг

З ліпеня 2021 года ў Беларусі адкрыта і публічна не працаваў ніводны рэсурсны цэнтр. Тым не менш, некалькі парасонавых і інфраструктурных арганізацый працягваюць працаваць з-за мяжы. Сярод іх Беларуская нацыянальная

платформа Форума грамадзянскай супольнасці Ўсходняга партнёрства, Беларускі нацыянальны моладзевы савет РАДА, Зялёная сетка, Беларускі Дом правоў чалавека і Беларуская Рада культуры. Гэтыя арганізацыі аказваюць тэхнічную дапамогу, праводзяць навучанне і мерапрыемствы па ўзмацненні патэнцыялу як для АГС у Беларусі, так і для тых, што працуюць у выгнанні. Акрамя таго, такія арганізацыі, як Беларускі Моладзевы Хаб і Free Belarus Center у Варшаве, «Кропка» ў Тбілісі і CreateCulture Space у Вільні, прапануюць беларускім АГС і актывістам каворкінгі, навучанне, кансультацыі і нэтворкінг, а таксама магчымасці арганізацыі мерапрыемстваў. Для ацэнкі патрэбаў АГС на працягу года было праведзена некалькі сектаральных даследаванняў, у тым ліку пастаянны маніторынг стану і патрэбаў беларускіх АГС ад SYMPA/BIPART.

ІНФРАСТРУКТУРА СЕКТАРА Ў БЕЛАРУСІ




У адказ на беспрэцэдэнтныя рэпрэсіі сектар грамадзянскай супольнасці працягваў засяроджвацца на самазахаванні, рэалізуючы рэгулярныя праграмы падтрымкі праваабаронцаў, журналістаў і актывістаў. Для АГС праводзіліся майстар-класы, трэнінгі і доўгатэрміновыя адукацыйныя курсы, пераважна анлайн. Беларускі нацыянальны моладзевы савет РАДА арганізаваў некалькі навучальных курсаў, у тым ліку трэнінгі для трэнераў, курсы па адвакатаванні, блогінгу, інклюзіі і іншым тэмам для моладзевых АГС і актывістаў. Арганізацыя «Іншыя» прапанавала анлайн-курс па арганізацыі мерапрыемстваў «Рабі смела!». Ментарская праграма па развіцці супольнасцяў раСНАТак правяла Школу развіцця супольнасцяў для паляпшэння гнуткіх навыкаў (у тым ліку камунікацыі, працы ў камандзе, кіравання канфліктамі і стрэсам) актывістаў з Беларусі. SYMPA/BIPART правяла ўнікальны васьмітыднёвы анлайн-курс па распрацоўцы праектаў і напісанні заявак на англійскай мове. У канцы 2022 года Беларускі Дом правоў чалавека запусціў навучальны курс па асновах кіравання АГС для арганізацый і ініцыятыў, якія пачалі працу ў 2020 годзе і пазней. Акрамя навучання, цягам года беларускія АГС мелі магчымасць атрымаць дапамогу ў эвакуацыі і рэлакацыі, псіхалагічную дапамогу, падтрымку стратэгічных сесій,

рэтрытаў, рэгістрацыі арганізацый за мяжой, а таксама прайсці стажыроўку ў замежных АГС. Большая частка гэтых паслуг аказвалася арганізацыямі, якія знаходзяцца за межамі краіны, але была разлічана на людзей і АГС, якія засталіся ў Беларусі.

Тым не менш, паслуг недастаткова, каб цалкам задаволіць патрэбы ў павышэнні патэнцыялу АГС, іх супрацоўнікаў і валанцёраў. Не хапае навучання па такіх тэмах, як арганізацыйнае і антыкрызіснае кіраванне, ацэнка рызык, справаздачнасць і прававое рэгуляванне дзейнасці АГС. У краіне востра не хапае дасведчаных трэнераў, фасілітатараў, кансультантаў па арганізацыйным развіцці і спецыялістаў па бяспецы, паколькі многія з іх пераехалі за мяжу ў 2021-2022 гадах.

У 2022 годзе рэлакаваныя АГС займаліся рэгрантынгам сродкаў, атрыманых як ад замежных донараў, так і праз краўдфандынг. Напрыклад, Беларускі Дом правоў чалавека разам з іншымі парасонавымі і сеткавымі аб'яднаннямі падтрымаў стабілізацыю, павышэнне патэнцыялу і інавацыйную дзейнасць беларускіх АГС у рамках праекта "Экстраная падтрымка і рэабілітацыя беларускіх АГС". У АГС у Беларусі зменшыўся доступ да фінансавання, бо практычна не існуе законных і бяспечных спосабаў пералічэння сродкаў у краіну.

Паводле вынікаў даследавання Lawtrend у снежні 2022 года, 43% апытаных беларускіх АГС з'яўляюцца чальцамі нацыянальных і міжнародных кааліцый або парасонавых структур. У 2022 годзе рэлакаваныя беларускія АГС сталі больш актыўна ўзаемадзейнічаць паміж сабой. Напрыклад, больш за 40 беларускіх арганізацый і ініцыятыўных груп у Грузіі ўзаемадзейнічаюць у межах Форума беларускіх АГС у Грузіі. У лютым пачало дзейнічаць нефармальнае Аб’яднанне беларускіх арганізацый у Польшчы. Фонд BYSOL, дабрачынны фонд «Краіна для жыцця», Dissidentby і дабрачынная арганізацыя Littowin LIONS CLUB стварылі кааліцыю для сумеснага правядзення кампаній па зборы сродкаў і дапамогі палітвязням і іх сем'ям. Узмацнялася супрацоўніцтва экалагічных АГС.

Міжсектаральныя партнёрствы ў 2022 годзе заставаліся мінімальнымі. Хаця ў большасці выпадкаў беларускія АГС больш не ўзаемадзейнічаюць з уладамі, ёсць некалькі прыкладаў, калі дзяржаўныя ўстановы запрашаюць на

мерапрыемствы прадстаўнікоў АГС, якія легальна працягваюць працаваць у Беларусі, прадастаўляюць ім памяшканні і пляцоўкі. Узаемадзеянне беларускіх АГС з уладамі ў краінах рэлакацыі найбольш сістэмнае і паспяховае ў Польшчы. Супрацоўніцтва паміж АГС і бізнесам застаецца слабым.

## ГРАМАДСКІ ІМІДЖ: 5.7 (2021: 5.5)

ГРАМАДСКІ ІМІДЖ У БЕЛАРУСІ




Імідж АГС у 2022 годзе пагоршыўся.

Дзяржава працягвае пераслед і ачарненне АГС і іх прадстаўнікоў у дзяржаўных СМІ. Напрыклад, у газеце адміністрацыі прэзідэнта прапагандыст Андрэй Мукавозчык параўноўвае АГС з тэрарыстамі і прыхільнікамі Сцяпана Бандэры (сімвала ўкраінскага нацыяналізму) і абвінавачвае нават лаяльных актывістаў АГС у імкненні перш за ўсё атрымаць доступ да замежных грошай. Дзяржаўныя СМІ заклікаюць да чыстак у АГС, заяўляючы: «Грамадзянская супольнасць павінна мець магчымасць ачысціцца на парозе, інакш потым будзе складаней».

Таксама дзяржава скажае сэнс паняцця «грамадзянская супольнасць» у публічнай прасторы. Адзіныя прадстаўнікі «грамадзянскай супольнасці» ў новым Беларускім Народным Сходзе — гэта АГС, створаныя дзяржавай (GONGO), такія як Белая Русь, Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі і Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі. Гэта скажае грамадскае ўяўленне аб тым, што такое АГС.

У Беларусі скарачаюцца каналы камунікацыі паміж АГС і грамадскасцю. «Экстрэмісцкімі фармаваннямі» абвяшчаюцца як недзяржаўныя СМІ, так і каналы, створаныя АГС, напрыклад, арганізацыяй «Сумленныя людзі». Доступ да іх інфармацыі без VPN блакуецца, а падпіска на прызнаныя экстрэмісцкімі каналы можа прывесці да пераследу, у тым ліку да крымінальнай адказнасці. У выніку беларусы практычна не маюць бяспечнага доступу да праўдзівай

інфармацыі пра АГС. Страх рэпрэсій перашкаджае беларусам асабіста ўдзельнічаць у дзейнасці АГС у краіне.

Тым не менш у 2022 годзе рэлакаваныя беларускія АГС умацавалі свой імідж сярод дыяспары, аказваючы дапамогу рэлакантам, і ствараючы ўласныя каналы камунікацыі, у тым ліку электронныя рассылкі, каналы і чаты ў Telegram, акаўнты на YouTube і ў Facebook. Рэлакаваныя беларусы шукаюць спосабы пашырыць сваё сацыяльнае кола на новых месцах жыхарства і падтрымліваць сувязі з Беларуссю. Гэтыя патрэбы яны задавальняюць, далучаючыся да дзейнасці беларускіх АГС у краінах рэлакацыі і ствараючы ўласныя АГС.

Паводле апытання, праведзенага Беларускім нацыянальным моладзевым саветам РАДА ў 2022 годзе, узровень ведаў аб АГС сярод беларускіх інтэрнэт-карыстальнікаў ва ўзросце ад 14 да 31 года нізкі. Крыху менш за палову (49%) рэспандэнтаў заявілі, што альбо нічога не ведаюць, альбо вельмі мала ведаюць пра АГС. Доля тых, хто заявіў, што добра разумее АГС, знізілася з 16% у 2020 годзе да 7% у 2022 годзе.

З-за рызыкі бяспекі празрыстасць і падсправаздачнасць АГС, якія працуюць у Беларусі, практычна не існуюць. Нават афіцыйна зарэгістраваныя арганізацыі радзей публікуюць абавязковыя справаздачы аб сваёй дзейнасці. Калі ў 2021 годзе на сайце Міністэрства юстыцыі было 100 такіх паведамленняў, то ў 2022 годзе іх было толькі 40. Справаздачнасць рэлакаваных АГС таксама абмежаваная, таму што ў беларускіх судах супраць актывістаў АГС выкарыстоўваецца любая даступная публічная інфармацыя. Напрыклад, у судзе над праваабаронцамі з ПЦ “Вясна” выкарыстоўваліся дадзеныя публічных справаздач і выпіскі з публічных рэестраў.

У цэлым АГС вельмі асцярожна афішуюць сваю дзейнасць і раскрываюць інфармацыю пра свае каманды. Многія АГС выдалілі інфармацыю пра сваіх супрацоўнікаў з сайтаў і пазбягаюць згадвання імёнаў актывістаў. Хаця гэтыя захады і спрыяюць бяспецы, яны таксама шкодзяць іміджу АГС. Рэлакаваныя АГС таксама ўстрымліваюцца ад апублічвання сваёй дзейнасці ў Беларусі, засцерагаючыся, што гэта можа справакаваць рэпрэсіі супраць цяперашніх або былых актывістаў, якія засталіся ў краіне.

У 2022 годзе было менш намаганняў па самарэгуляванні ў сектары АГС, такіх як прасоўванне этычных кодэксаў. Напрыклад, камісія па этыцы БАЖ спыніла сваю дзейнасць і ў 2022 годзе не апублікавала ніякіх рашэнняў.

U.S. Agency for International Development

1300 Pennsylvania Avenue, NW
Washington, DC 20523
Tel: (202) 712-0000
Fax: (202)216-3524

www.usaid.gov